Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

# СЕКЦИЯ 5 «ТЕКСТ И НАРРАТИВ В ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНОМ ПРОСТРАНСТВЕ БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЕЛЬ XVI–XXI вв.»

*Р.А. Колас*

## Эразм Ратэрдамскі – кніжны аракул Еўропы

Дадзены артыкул разглядае важнасць кніжнай спадчыны еўрапейскага гуманіста Эразма Ратэрдамскага на прыкладзе твора «Даведнік рыцара-хрысціяніна, напоўнены карыснымі навучаннямі» з фонду рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а таксама раскрывае хрысціянскія філасофскія і мастацкія бакі названай працы.

*Ключавыя словы:* Эразм Ратэрдамскі, еўрапейскі гуманізм, хрысціянская філасофія, ініцыялы, выданні XVI стагоддзя.

*Р.А. Колос*

## Эразм Роттердамский – книжный оракул Европы

В данной статье рассматривается значение книжного наследия европейского гуманиста Эразма Роттердамского на примере книги «Справочник христианских рыцарей, наполненный полезными поучениями» из фонда редких книг и рукописей Центральной научной библиотеки имени Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси, а также раскрывает христианско-философские и художественные аспекты этого произведения.

*Ключевые слова:* Эразм Роттердамский, европейский гуманизм, христианская философия, инициалы, издания XVI века.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

*R.A. Kolas*

**Erasmus of Rotterdam, a book oracle of Europe**

This article examines the importance of the book heritage of the European humanist Erasmus of Rotterdam by the example of the work «Handbook of a Christian knight filled with useful instructions» from the rare books collection of the Yakub Kolas Central Scientific Library of the National Academy of Sciences of Belarus, and also reveals the Christian philosophical and artistic aspects of this work.

*Keywords:* Erasmus Roterodamus, European humanism, Christian philosophy, initials, XVI century editions.

Эразма Ратэрдамскага па праву можна назваць буйнейшым філосафам Паўночнага Адраджэння. Будучы каталіцкім святаром, ён быў вельмі важнай фігурай у класічнай навуцы, якая шмат паўплывала на грамадска-палітычную думку таго часу, і ўплыў якой мы прасочваем і сёння. Сярод такой яскравай тагачаснай плыні аматараў чалавека, ён быў празваны «Вянком славы хрысціянскіх гуманістаў», а таксама «Прынцам гуманістаў». Эразм Ратэрдамскі займае асаблівае месца ў гісторыі тагачаснай Еўропы. Ён стаў першым чалавекам у гісторыі, хто атрымаў пры жыцці падобную пашану ў грамадстве з прадстаўнікоў мастацтва, навукі і літаратурна-асветніцкай дзейнасці. Менавіта дзякуючы кнігадрукаванню і станаўленню інстытута публічных бібліятэк у часы эпохі Адраджэння ягоныя ідэі, якія праз кнігі знаходзілі водгук у чалавечых розумах як пры яго жыцці, так і стагоддзі пасля, атрымоўвалі падобнае шырокае распаўсюджванне. Пра наяўнасць падобнага высокага статусу ў грамадстве сведчаць факты прапановы з боку Папскай курыі сана кардынала. Баварскі ўрад выказваў гатоўнасць прызначыць яму буйную пенсію толькі за тое, каб ён выбраў Нюрнберг месцам свайго пастаяннага жыхарства. Падчас паездак Эразма некаторыя гарады ладзілі яму ўрачыстыя сустрэчы, як гаспадару. Менавіта за вольнасць думкі, форму мовы, крытыч-



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

нае трактаванне Новага Запавету яго празвалі «Аракулам Еўропы» [1].

Выкарыстоўваючы гуманістычныя метады працы з тэкстамі, ён падрыхтаваў новыя важныя лаціна- і грэкамоўныя выданні Новага Запавету, у якіх былі ўзнятыя пытанні, што аказалі ўплыў на пратэстанцкую Рэфармацыю і каталіцкую Контррэфармацыю хрысціянскага грамадства і думкі. Адной з найбольш вядомых ягоных прац з'яўляецца «Пахвала глупству» альбо «Хвалебнае слова глупству» 1506 г. Але за некалькі год да яе напісання Эразм Ратэрдамскі стварыў адзіны з першых сваіх самастойных і ўласных твораў прасякнутых ідэямі чалавекалюбства, імкненнем да спасціжэння ідэі Бога і набліжэння да Яго, высакароднасцю душы, пошуку выйсця са складаных абставіннаў, а таксама адказаў на пытанне «як жа застацца хрысціянінам?». Гэтай працай з'яўляецца «Даведнік рыцарахрысціяніна, напоўнены карыснымі навучаннямі» 1503 г. У фондзе рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук захоўваецца асобнік прыжыццёвага выдання дадзенай працы Эразма Ратэрдамскага, надрукаваны ў 1518 г. у горадзе Базель (сучасная Швейцарыя). На прыкладзе дадзенага экзэмпляра і будзе праведзены аналіз станаўлення філасофіі Эразма Ратэрдамскага і важнасці кніжнай культуры таго часу.

Досыць цікавай з'яўляецца гісторыя напісання дадзенага твору. Напісаны ён быў у 1501 г. пасля таго, як падчас знаходжання ў Турнехеме, каля замку недалёка ад Сен-Амэра (на поўначы сучаснай Францыі) Эразм сутыкнуўся з «нецывілізаваным», але прыязным рыцарам, які быў знаёмы з Батусам Рэнанусам (блізкім сябрам Эразма). Па просьбе набожнай жонкі рыцара, якая адчувала сябе абдзеленай паводзінамі свайго мужа, Батус папрасіў Эразма напісаць тэкст, які пераканаў бы рыцара ў неабходнасці выправіцца, што ён і зрабіў [2]. Напісаная праца была ў канчатковым выніку перапрацаваная Эразмам і пашырана да «Enchiridion militis Christiani». «Даведнік…» з'яўляецца заклікам для хрысціян дзейнічаць у адпаведнасці з хрысціянскай верай, а не проста выконваць неабходныя абрады. Шмат у чым ён спасылаецца на метафару Паўла пра «духоўныя даспехі»,



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

якая ў XVI ст. набыла папулярнасць толькі дзякуючы працы Эразма. Тут жа філасофскі ўплыў Эразма назіраецца і ў гравюрах таго часу. Так, інтэрпрэтуючы вядомы нямецкі твор мастацтва «Рыцар, смерць і д’ябал», які стварыў Альбрэхт Дзюрар (яму таксама належаць гравюры з выявай самога Эразма Ратэрдамскага), навукоўцы мяркуюць, што вобраз рыцара, паказанага ў фізічных даспехах, можна інтэрпрэтаваць з пункту гледжання Эразма, каб прадставіць чалавека, які здольны перамагчы сваіх ворагаў, ігнаруючы іх «у сваім імкненні да мэты» хрысціянскай дабрачыннасцю [3].

Дадзены экзэмпляр, надрукаваны на лацінскай мове, ўяўляе сабой кнігу памерам 15х15 санцыметраў. Кніга абкладзена пергаментам у якасці вокладцы, з рудым надпісам на карэньчыку кнігі «ERASMI ENCHIRIDION MILITIS CHRIST.». Складаецца з 397 старонак, пафарбаваных у чырвоны колер па баках.

На першай тытульнай старонцы, упрыгожанай выявамі раслін з суніцамі, дэкаратыўных калон іянічнага стылю, у падмурку якіх можна заўважыць профілі манахаў (аб гэтым сведчыць наяўнасць танзуры) паміж якімі свае крылы раскідвае арол, звязаных паміж сабою птушак і змей, коней з факеламі і тварам анёла, чый погляд скіраваны ўніз, на тэкст, надпіс: «Даведнік рыцара-хрысціяніна, напоўнены карыснымі навучаннямі, аўтарства Дэзідэрыуса Эразма Ратэрдамскага. Прадмова і эпілог напісаны тым жа ўкладальнікам. Спіс дэманструе каталог на якасных старонках».

Наступны аркуш прадстаўляе сабой самыя дэталёвыя гравюры з яскравымі біблейскімі сюжэтамі. Сярод іх – сцэны змагання з д’яблам (у самым версе), які прадстаўлены ў выглядзе немаўляткі з барадою і рагамі. Па баках – ужо знаёмыя мініяцюры з раслінамі і суніцамі, немаўляткамі, што трымаюць у руках (з правага боку) і на спінах (з левага боку) п’едэсталы з імі. На самай апошняй частцы дазенага цыклу мы бачым наступствы вышэйнамаляванай бойкі: чарапы памерлых, зброю, немаўлятак і двух дарослых, якія раскрываюць для гледача кадуцей, паміж галовамі змеяў птушка, мабыць, як сімвал Святога Духа. Наяўнасць немаўлят у цыкле гравюр адсылае нас да хрысціянскай максімы, што «ўсе мы – дзеці Божыя».



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

У пацвярджэнне гэтага можна прывесці таксама і наяўнасць біблейскага сюжэту ў выглядзе ініцыяла першай літары Q, якая прадстаўлена паверх сюжэту забойства аднаго немаўляткі мячом іншага, але яго руку з мячом спыняе анёл. Надпіс на дазеным аркушу абвяшчае: «Вялебны Хрысце, Айцу Паўлу Вользіо рэлігійнаму святару лямант, які звычайна называюць прыдворным хугонісам (хутчэй за ўсё, маецца на ўвазе адзін з відаў ружы), Дэзідэрыус Эразм Ратэрдамскі».

Пасля дадзенай прадмовы, пачынаецца тэкст асноўнай працы. Тут важна адзначыць наяўнасць друкаваных маргіналій і вельмі прыгожых, аўтэнтычных ініцыялаў, якія раскрываюць як хрысціянскія, так і антычныя сюжэты. У большасці сваёй літары прадстаўлены светлай формай на фоне дадзеных сюжэтаў з немаўляткамі. Усе прыгожыя ініцыялы, як і самую апошнюю гравюру дадзенай кнігі стварыў Ганс Гальбейн, які быў сябрам Ратэрдамскага. На заключным аркушы прадстаўлены ўжо знаёмыя сюжэты з немаўляткамі, якія граюць на трубах і адкрываюць кадуцей з птушкай. Дадзеная гравюра адрозніваецца ад іншых менавіта сваёй маштабнасцю, паколькі на яе адведзены цэлы аркуш, і дэталёвасцю элементаў: больш тонка выяўлены калоны, расліны. Упершыню можна пабачыць постаць жанчыны з антычных сюжэтаў пра муз.

Галоўную філасофскую ідэю дадзенай працы можна апісаць цытатай самога Эразма Ратэрдамскага: «намагацца, каб жыць». У гэтай невялічкай працы Эразм выкладае свае погляды на правільнае хрысціянскае жыццё, на фарміраванне якіх паўплывалі ягоныя вандроўкі, навучанні, знаёмствы і сустрэчы з рознымі людзьмі. Ён кажа, што галоўнае зло сучаснасці – гэта фармалізм. Ён сцвярджае, што грамадства прытрымліваецца традыцый без разумення іх асновы ў вучэнні Хрыста. Формы могуць вучыць душу пакланяцца Богу, а могуць хаваць або душыць яе. У сваім даследаванні небяспекі фармалізму Эразм абмяркоўвае манаства, пакланенне святым, вайну, маёмаснае расслаенне і слабасці грамадства. «Даведнік рыцара-хрысціяніна, напоўнены карыснымі навучаннямі» – гэта своеасаблівая першая прапаведзь Ратэрдамскага. З яго дапамогай Эразм кінуў выклік агульнапрынятым паданням, адлюстраваўшы духавенства як педаго-



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

гаў, якія павінны дзяліцца скарбніцай сваіх ведаў з парафіянамі. Ён будуе падмурак сваёй філасофіі на асабістых духоўных дысцыплінах і заклікае да Рэфармацыі, якую ахарактарызоўвае як калектыўнае вяртанне да Бацькоў царквы і Пісання. Самае галоўнае тое, што ён уздымае чытанне Святога Пісання як жыццёва важнае дзеянне, бо праз яго чалавек набывае моц быць чалавекам і заахвочваецца да любові. Падобна Братам агульнага жыцця, ён пісаў, што Новы Запавет – гэта закон Хрыста, якому людзі закліканы падпарадкоўвацца, і што Хрыстос – гэта прыклад, які яны закліканы пераймаць, а значыць, да якога прагнуць наблізіцца і ўпадобіцца.

12 ліпеня 1536 года Дызідэрыус Эразм Ратэрдамскі памёр у Базелі, дзе быў пахаваны ў кафедральным саборы горада. Тут, побач з адным з самых старажытных еўрапейскіх універсітэтаў і бібліятэкай, ён знайшоў свой апошні прытулак. Але ягоныя ідэі і думкі праз стагоддзі, дзякуючы кнігадрукаванню і захаванню ў бібліятэчных установах, працягваюць сваё жыццё побач з намі.

1. *Latourette K.S.* History of Christianity. New York : Harper & Brothers, 1953. P. 661.

2. *Roterodamus E.* The Erasmus Reader. Toronto : University of Toronto Press, 1990. P. 138.

3. *Sinkević I.* Knights in Shining Armor: Myth and Reality 1450–1650. Chicago, 2006. P. 69.

*В.В. Урублеўскі*

## Метрычныя кнігі на захаванні ў апісанай частцы калекцыі № 23 Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (вопіс 1)

У артыкуле праводзіцца крыніцазнаўчая характарыстыка 14 метрычных кніг з апісанай часткі «Калекцыі матэрыялаў па гісторыі, навуцы, культуры» (№ 23) Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Адзначаюцца перспектывы далейшага выяўлення метрычных кніг у матэрыялах калекцыі, індэксацыі найбольш



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by